УДК 355.233.231.1Ушынскі

# ПАТРЫЯТЫЧНАЕ ВЫХАВАННЕ Ў ПЕДАГАГІЧНАЙ СІСТЭМЕ К. Д. УШЫНСКАГА

***А. Л. Ралюк,*** *намеснік дырэктара па вучэбнай рабоце дзяржаўнай установы адукацыі «Сярэдняя школа № 19 г. Магілёва», г. Магілёў*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжана месца патрыятычнага выхавання ў педагагічнай сістэме К. Д. Ушынскага. Раскрыты погляды педагога на тэарэтычныя асновы выхавання ў духу патрыятызму, любові да Радзімы і свайго народа. Абгрунтавана, што ў іх аснове – ідэя народнасці. Звернута ўвага на ролю роднай мовы, гісторыі, геаграфіі, прыродазнаўства, народнай творчасці ў патрыятычным выхаванні.
**Ключавыя словы**: Канстанцін Ушынскі, патрыятызм, патрыятычнае выхаванне, любоў да роднага краю, ідэя народнасці, Радзіма.

# PATRIOTIC EDUCATION IN THE PEDAGOGICAL SYSTEM OF KONSTANTIN USHINSKY

***A. Ralyuk,*** *Deputy Director for Academic Affairs of the State Educational Institution «Secondary School № 19 of Mogilev», Mogilev*

**Abstract.** The article reveals the place of patriotic education in the pedagogical system of K. Ushinsky. The article reveals the teacher's views on the theoretical foundations of education in the spirit of patriotism, love for the motherland and one's people. The author substantiates that they are based on the idea of nationality and draws attention to the role of the native language, history, geography, natural science, folk art in patriotic education.
**Keywords:** Konstantin Ushinsky, patriotism, patriotic education, love for the native land, the idea of nationality, Homeland.

У педагагічнай спадчыне Канстанціна Дзмітрыевіча Ушынскага (1823–1870/1871) ключавое месца займае ідэя народнасці выхавання, якая трактуецца дастаткова шырока. Тэрмін «народнасць» у яго разуменні – гэта гісторыя таго ці іншага народа, гістарычнае развіццё, геаграфічныя і прыродныя ўмовы, у якіх жыве народ, эканамічныя, сацыяльныя, культурныя, нацыянальныя і іншыя асаблівасці народаў. Агульнай асаблівасцю ўсіх народаў К. Д. Ушынскі лічыў выхаванне

людзей. Яшчэ ў 1857 г. ён пісаў: «Выхаванне павінна прасвятліць свядомасць чалавека, каб перад вачыма ляжаў ясна шлях дабра» [1, с. 159].

У артыкуле «Аб народнасці ў грамадскім выхаванні» [1] ён адлюстраваў сваё меркаванне, што менавіта народнасць з'яўляецца фундаментам выхавання падрастаючага пакалення ў духу патрыятызму, любві да Радзімы і свайго народа. Народнасць выхавання па К. Д. Ушынскаму – гэта важны сродак усебаковага вывучэння сваёй Радзімы, сродак патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення.

Выхаванне прадугледжвае веданне нацыянальных каштоўнасцей і прыхільнасць да іх выхавальніка, разуменне мэт, якія стаяць перад чалавецтвам, і спробы ажыццявіць іх па меры ўласных сіл. У педагагічным сэнсе важным з'яўляецца тое, што пачуццё нацыянальнага – прыроджанае, і К. Д. Ушынскі прапаноўвае ўзяць яго за аснову выхавання. Менавіта таму ў аснову яго педагагічнай сістэмы пакладзены прынцып народнасці як адзіная крыніца жыцця народа ў гісторыі.

Будучы палкім патрыётам сваёй Радзімы, К. Д. Ушынскі ў справе выхавання маладога пакалення вялікую ролю надаваў патрыятычным пачуццям: «Як няма чалавека без самалюбства, так няма чалавека без любові да Айчыны, і гэтая любоў дае выхаванню верны ключ да сэрца чалавека і магутную апору» [1, с. 160].

Фундаментам выхавання дзяцей і падлеткаў у духу патрыятызму К. Д. Ушынскі лічыў народнасць. Народнасць разумеецца ім як глыбокая вера ў творчыя сілы сваёй краіны, як патрабаванне перадаць справу народнай асветы народу, пабудова сістэмы выхавання ў адпаведнасці з асаблівасцямі розных нацый, якія насяляюць краіну, і ўмоў жыцця. Заснаванае на народнасці выхаванне развівае ў дзяцей пачуццё патрыятызму, нацыянальнага гонару, доўгу перад радзімай, прывучае заўсёды ставіць грамадскія інтарэсы вышэй за асабістыя. Дзіця любіць сваё роднае месца з усімі прыроднымі багаццямі і прыгажосцю, любіць мацярынскую мову і песні. Натуральныя пачуцці любві да свайго роднага замацоўваюцца, распаўсюджваюцца і ўсведамляюцца ўжо ў дашкольным узросце дзякуючы хатняму ўплыву.

Педагог неаднаразова падкрэсліваў, што кожны народ мае свой асаблівы ідэал чалавека і патрабуе ад свайго выхавання аднаўлення яго ідэалу ў асобна ўзятай асобе. Ідэал кожнага народа адпавядае яго характару, вызначаецца яго грамадскім жыццём і развіваецца разам з яго развіццём. Народнасць «ёсць да гэтага часу адзінай крыніцай жыцця народа ў гісторыі» [1, с. 161] і «грамадскае выхаванне, якое ўмацоўвае і развівае ў чалавеку народнасць, развіваючы ў той жа час яго розум і яго

самасвядомасць, магутна садзейнічае развіццю народнай самасвядомасці наогул <...> і дабрадзейны ўплыў на развіццё грамадства» [1, с. 162].

Нягледзячы на падабенства педагагічных формаў усіх еўрапейскіх народаў, у кожнага з іх свая асаблівая мэта і свае асаблівыя сродкі яе дасягнення, а таму запазычанні адным народам у іншага выхаваўчых сістэм немагчымы. «Немец, англічанін, француз, амерыканец патрабуюць ад выхавання не аднаго і таго ж» [4, с. 122]. Ідэя народнасці выхавання была накіравана супраць уплыву на айчынную школу адукацыйных сістэм заходнееўрапейскіх краін, механічнага пераносу на айчынную глебу сістэмы выхавання і навучання, якія склаліся ў іншых дзяржавах, у іншых гістарычных умовах.

Адной з прыкмет народнасці, адзначаў К. Д. Ушынскі, з'яўляецца мова – найлепшы выразнік духоўнай культуры народа, якая адлюстроўвае ўсё багацце і шматграннасць чалавечага жыцця. Асноўнымі задачамі народнай школы ў выхаванні асобы ён лічыў фарміраванне патрыятызму сродкамі роднай мовы, якая не толькі выражае духоўныя якасці народа, але і з'уляецца лепшым яго настаўнікам, які вучыў народ яшчэ тады, калі не было ні кніг, ні школы.

Дзіця з першых гадоў павінна вывучаць родную мову, засвойваць народную духоўнасць. І пакуль яно не авалодае «духам мовы», «дух народа, якія стварыў гэтую мову», не «пусціць глыбокія карані ў яго душу», нельга прапаноўваць яму іншыя каштоўнасці, іншую духоўнасць. У іншым выпадку чалавек будзе непатрэбным членам грамадства, «а часам і вельмі цяжкім членам, застанецца нікчэмным чалавекам без айчыны, якую бы маску патрыятызму ні апранаў бы ён потым» [2, с. 566].

Казкі, народныя песні, прыказкі адлюстроўваюць народую думку аб іх гістарычным развіцці. Яны з'яўляюцца тым мосцікам, які злучае адно пакаленне з іншым. У працы «Роднае слова (кніга для тых, хто вучыцца)» [2, с. 554–574] паказана, што праз казку народ распавядае дзецям свае дзіцячыя мары і напалову сам верыць у гэтыя мроі. На думку педагога, народную казку дзеці чытаюць лёгка. Яна даволі хутка запамінаецца з усімі жывапіснымі дэталямі і народнымі выслоўямі.

Народную казку педагог ставіў недасягальна вышэй усіх расказаў, напісаных для дзяцей. У прыказках, лічыў ён, адлюстроўваліся ўсе аспекты жыцця народа, яго патрэбнасці, звычкі, яго погляд на прыроду, на людзей, на значэнне ўсіх з'яў жыцця. Здабыткі народа перадаюцца з пакалення ў пакаленне. «Усякая жывая гістарычная народнасць ёсць самае выдатнае стварэнне божае на зямлі, і выхаванню застаецца толькі чэрпаць з гэтай багатай і чыстай крыніцы» [1, с. 163].

Ідэі К. Д. Ушынскага па выхаванні любві да роднага краю ў дзяцей маюць асаблівае значэнне, паколькі ў дзяцей да 6–7 гадоў дамініруюць дзве асноўныя патрэбнасці: у пазнавальнай дзейнасці і зносінах. І таму

вывучэнне роднага краю для іх мае асаблівае значэнне. У сувязі з гэтым К. Д. Ушынскі адзначаў: «Няма сумнення, што дзеці больш за ўсё вучацца пераймаючы, але памылкова было б думаць, што з перамання сама сабою вырасце самастойная дзейнасць. Пераймане дае шмат матэрыялу для самастойнай дзейнасці, але калі б не было самастойнай дзейнасці, незалежнай ад пераймання, то няма чаму было б і пераймаць» [4, с. 538].

Патрыятызму вучыцца дзіця пад умелай рукой выхавальніка пры кожнай магчымасці, падчас размоў, пры навучанні геаграфіі, гісторыі, геалогіі, прыродазнаўству. Аналізуючы выхаванне дзяцей, пабудаванае на любві да Радзімы, і звычайнае тагачаснае школьнае выхаванне, К. Д. Ушынскі лічыў, што школьнае выхаванне не можа рашыць праблему народнага выхавання. «Школьнае выхаванне далёка не пакідае ўсяго выхавання народа <…> усё, з чаго складаецца гістарычнае жыццё народа, – складаюць яго сапраўдную школу, перад сілай якой сіла вучэбных устаноў, асабліва пабудаваных на пачатках штучных, зусім нікчэмна» [1, с. 148].

З гэтай нагоды К. Д. Ушынскі звязваў радзімазнаўства з геаграфіяй і гісторыяй, рабіў упор на вывучэнні прыроды мясцовасці, у якой размяшчаецца школа, і паступовым авалодванні ведамі аб яе гісторыі, культуры. У працэсе навучання, дзеці «складаюць план наваколля, план ракі, якая сваёй плынню павінна вывесці дзіця з найбліжэйшага наваколля ў шырокую айчыну» [3, с. 319].

Патрыятызм з'яўляецца вынікам адлюстравання Радзімы, успрыняцця традыцый мінулага ў свядомасці чалавека праз прызму сучасных патрэб і інтарэсаў, якія, са свайго боку, істотатна актывізіруюць, узбагачаюць матывы жыццядзейнасці чалавека і становяцца моцнай рухаючай сілай развіцця асобы і грамадства.

Такім чынам, аналіз педагагічнай сістэмы К. Д. Ушынскага дазваляе вылучыць у якасці асновы патрыятызму ідэю народнасці, а родную мову, родную гісторыю, геаграфію, народную творчасць і г. д. – у якасці сродкаў патрыятычнага выхавання. Пачуццё патрыятызму, якое фарміруецца з ранняга дзяцінства ў сям'і, робіцца яшчэ больш моцным і выразным, калі дзіця глыбока пазнае сваю Радзіму, свой народ, яго звычаі і традыцыі. Няведанне і ігнараванне роднай гісторыі і мовы, нацыянальнай культуры, адступленне ад шматвекавых традыцый непапраўна шкодзяць фарміраванню патрыятычных пачуццяў. У сучасных рэаліях асэнсаванне спадчыны К. Д. Ушынскага прадстаўляецца важнай крыніцай для развіцця тэорыі і практыкі патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення.

1. *Ушинский, К. Д.* О народности и общественном воспитании / К. Д. Ушинский // Собр. соч. : в 11 т. – М. ; Л., 1948–1952. – Т. 2 : Педагогические статьи, 1857–1861 гг. – 1948. – С. 69–166.

2. *Ушинский, К. Д.* Родное слово / К. Д. Ушинский // Собр. соч. : в 11 т. – М. ; Л., 1948–1952. – Т. 2 : Педагогические статьи, 1857–1861 гг. – 1948. – С. 554–574.

3. *Ушинский, К. Д.* Родное слово. Книга для учащих / К. Д. Ушинский // Собр. соч. : в 11 т. – М. ; Л., 1948–1952. – Т. 6 : Родное слово : кн. для детей : год 1-й и 2-й. Родное слово : кн. для учащих. – 1949. – С. 237–336.

4. *Ушинский, К. Д.* Человек как предмет воспитания. Педагогическая антропология. Т. 2 / К. Д. Ушинский // Собр. соч. : в 11 т. – М. ; Л., 1948–1952. – Т. 9 : Человек как предмет воспитания. Опыт педагогической антропологии, т. 2. – 1950. – С. 13–564.